# Народная Асвета

12/1996

7. Баланс інтарэсаў розных груп педагогаў у адносінах да таго ці іншага новаўвядзення. Нельга забываць, што выбраная ідэя ў той ці іншай меры можа адпавядаць густам і інтарэсам уплывовых у калектыве педагогаў, нефармальных лідэраў і груп.

8. Магчымае супраціўленне новаўвядзенню ўзнікае з боку тых педагогаў, прапановы якіх не прыняты, нядаўніх носьбітаў перадавога вопыту, для якіх новаўвядзенні на сучасным узроўні не пад сілу, а інавацыі — крыніца неспакою, страты звыклага, «лянівага» існавання з адпаведнымі арганізацыйнымі вывадамі (звальненне, перавод на другарадную пасаду).

9. Час, неабходны для асваення новаўвядзення. Плануючы апошняе, педагогі павінны ўлічваць, колькі часу спатрэбіцца для ўкаранення (асваення) новаўвядзення, таму што колькасць этапаў дадзенага працэсу залежыць ад умоў дзейнасці пазашкольнай установы.

10. Фінансавыя затраты на асваенне новай ідэі і яе матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне. Грошы патрэбны на набыццё абсталявання, на зарплату педагогам, на аплату навуковых кансультацый і экспертыз, на распрацоўку праграм развіцця, на запрашэнне спецыялістаў для аказання навукова-метадычнай дапамогі, правядзення семінараў, «круглых сталоў», канферэнцый, тыражыравання тэкстаў і г.д.

11. Арганізацыйныя ўмовы. У пазашкольнай установе адсутнічаюць структурныя падраздзяленні ці штатныя пасады, неабходныя для ажыццяўлення інавацыйнай палітыкі. Напрыклад, для арганізацыі дзейнасці педкалектыву МПДМ па фарміраванню і развіццю творчай асобы школьніка ва ўмовах палаца неабходна ўвядзенне пасады намесніка дырэктара па навукова-метадычнай ці доследна-эксперыментальнай рабоце (на поўную стаўку або частку яе — у залежнасці ад радыкальнасці пераўтварэнняў), стварэнне навукова-метадычнага цэнтра на ўмовах часовага творчага калектыву.

12. Нарматыўна-прававое забеспячэнне. Калі мяркуецца правядзенне працяглага эксперыменту, узнікае неабходнасць у дазволе на яго з боку адпаведнага органа адукацыі, ва ўзгадненні з іншымі навучальнымі ўстановамі, у заключэнні гаспадарчых дагавораў, працоўных пагадненняў, у правядзенні медыцынскай ці іншай экспертызы.

13. Прыцягальнасць ідэі. Гэты фактар індывідуальны, суб'ектыўны па характару, цалкам залежыць ад асабістых густаў, інтарэсаў, поглядаў тых людзей, якія выбіраюць аптымальныя ідэі новаўвядзенняў. Для таго, хто любіць дакладную мову навукі, такі выбар — адпаведнасць інавацый асабістым інтарэсам і густам тых педагогаў, якія зацікаўлены ва ўкараненні новага і гатовы да яго.

**(Заканчэнне будзе)**



# ЭТЫКА–ПЕДАГАГІЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ (XVI — XVII стст.)

## Праграма і метадычныя рэкамендацыі да спецкурса

***В. С. БОЛБАС,***
***загадчык кафедры педагогікі Мазырскага дзяржаўнага недінстытута, кандыдат педагагічных навук***

Вострая неабходнасць істотных змен у арганізацыі і ўдасканаленні маральнага выхавання падрастаючых пакаленняў патрабуе ўзбраення ўсіх, хто займаецца выхаваўчымі пытаннямі, абгрунтаванай тэорыяй, якая здольна ўплываць на жадаемыя вынікі. А стварэнне яе немагчыма без выкарыстання глыбінных каранёў айчыннай педагагічнай думкі. Менавіта ігнараванне нацыянальных і рэгіянальных асаблівасцей пры вырашэнні задач значна зніжае эфектыўнасць выхаваўчых намаганняў.

Для сучаснага перыяду вялікую каштоўнасць уяўляюць маральна-выхаваўчыя падыходы, характэрныя для пераходных эпох жыцця беларускага народа. Так, карэннай ломкай поглядаў, што ўсталяліся, на зямное прадвызначэнне чалавека вызначаецца грамадска-педагагічная думка Беларусі эпохі Адраджэння, што асабліва сугучна працэсам, якія адбываюцца ў сённяшняй рэчаіснасці. Многія ідэі педагагічных і грамадскіх дзеячаў феадальнай Беларусі і цяпер не толькі выклікаюць пазнавальную цікавасць, а і могуць служыць метадалагічнай асновай для адпаведных тэарэтычных і практычных распрацовак, непасрэдна выкарыстоўвацца ў арганізацыі выхавання падрастаючых пакаленняў.

Адной з прычын таго складанага становішча, у якім сёння апынулася маральнае выхаванне, з'яўляецца тое, што ў папярэднія гады выхаваўчы працэс будаваўся на даволі неглыбокім і вузкім падмурку. Карані ідэй, якія сілкавалі этыка-педагагічную думку, апускаліся на глыбіню ўсяго некалькі дзесяцігоддзяў і былі абмежаваны рамкамі існаваўшай палітычнай сістэмы. Такая стэрэатыпнасць у многім працягвае захоўвацца і ў нашы дні.

Выйсце бачыцца не толькі ў адмаўленні ад існаваўшых ідэалагічных штампаў і стэрэатыпаў, а і ў недапушчэнні магчымасці апынуцца ў палоне новых ілюзорных уяўленняў. Тэорыя і практыка

маральнага выхавання павінна ўзяць на ўзбраенне ўсё лепшае, што назапашана шматвяковым сусветным і айчынным вопытам.

Вось чаму асноўны змест дадзенага спецкурса складае сістэматызаваны аналіз этыка-педагагічных ідэй славутых мысліцеляў Беларусі XVI—XVII стст., чые погляды грунтаваліся на выверапых часам народна-выхаваўчых набытках, улічвалі дасягненні сусветнай педагагічнай думкі, адлюстроўвалі перспектыўныя напрамкі гістарычнага развіцця грамадства і адпавядалі існаваўшай рэчаіснасці. Для больш поўнага асэнсавання ўкладу айчынных педагогаў-мысліцеляў у развіццё тэарэтычных асноў маральнага выхавання ў асобных выпадках праводзіцца паралельны аналіз іх поглядаў з адпаведнымі ідэямі буйных заходнееўрапейскіх вучоных-педагогаў.

Дэталёвы аналіз дазваляе прыйсці да высновы, што этыка-педагагічны напрамак грамадскай думкі Беларусі эпохі Адраджэння, нягледзячы на значны іншаземны ўплыў, меў глыбінныя айчынныя карані і фарміраваўся на ўласнай этнакультурнай аснове. Не менш важнай задачай дадзенага спецкурса з'яўляецца раскрыццё арыентаванасці беларускай педагагічнай і грамадскай думкі XVI—XVII стст. на агульначалавечыя маральныя каштоўнасці пры паказе яе гуманістычнага і дэмакратычнага характару.

Увесь матэрыял падзелены на тэмы, вывучэнне якіх дапаможа найбольш поўна і ўсебакова асэнсаваць стан этыка-педагагічнай думкі Беларусі разглядаемага перыяду, а таксама значна спросціць непасрэднае выкарыстанне маральна-выхаваўчых ідэй сярэднявечча ў сучаснай нацыянальнай школе.

Наогул нельга сабе ўявіць сучаснага педагога нашай рэспублікі, які б не быў дасведчаны ў пытаннях развіцця беларускай культуры. Таму перад дадзеным спецкурсам стаіць наступная мэта: вывучэнне асноў айчыннай педагагічнай тэорыі, павышэнне навукова-метадычнага ўзроўню і ўзбагачэнне арсенала выхаваўчых сродкаў будучых настаўнікаў — выхавальнікаў нацыянальнай школы.

Спецкурс разлічаны на студэнтаў усіх факультэтаў педагагічных ВНУ і можа таксама быць выкарыстаны ў іншых педагагічных навучальных установах.

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН СПЕЦКУРСА

| № п/п | Тэма | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
|---|---|---|---|
| 1 | Асноўныя крыніцы развіцця этыка-педагагічнай думкі Беларусі XVI—XVII стст. | 2 | |
| 2 | Педагагічная думка Беларусі эпохі Адраджэння аб мэтах маральнага выхавання і яго ролі ў жыцці грамадства | 2 | |
| 3 | Маральна-педагагічныя ідэі Францыска Скарыны | | 2 |
| 4 | Распрацоўка зместу маральнага выхавання ў працах айчынных грамадскіх і педагагічных дзеячаў XVI—XVII стст. | 2 | |
| 5 | Мысліцелі Беларусі XVI—XVII стст. аб патрабаваннях да арганізацыі маральнага выхавання | 2 | |
| 6 | Уклад Сымона Буднага ў фарміраванне тэарэтычных асноў маральнага выхавання | | 2 |
| 7 | Метады і сродкі маральнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння | 2 | |
| 8 | Дасягненні асветнікаў — педагогаў Беларусі XVI—XVII стст. у развіцці тэорыі маральнага выхавання | 2 | |
| 9 | Маральна-выхаваўчы аспект педагагічнай спадчыны Сімяона Полацкага | | 2 |
| | Усяго | 12 | 6 |



## ПРЫКЛАДНАЕ ПЛАНАВАННЕ І ЗМЕСТ ЛЕКЦЫЙНЫХ ЗАНЯТКАЎ

**Тэма 1. Асноўныя крыніцы развіцця этыка-педагагічнай думкі Беларусі XVI—XVII стст.**

*План*

1. Сацыяльна-эканамічныя перадумовы распрацоўкі ідэй маральнага выхавання ў Беларусі эпохі Адраджэння.
2. Народна-выхаваўчы вопыт — падмурак фарміравання этыка-педагагічных поглядаў славутых айчынных мысліцеляў.
3. Пастулаты хрысціянскай этыкі і развіццё айчыннай педагагічнай думкі.
4. Выкарыстанне ідэй старажытных філосафаў у педагагічнай думцы Беларусі.
5. Уплыў Рэфармацыі і Адраджэння на развіццё ідэй маральнага выхавання.

*Прыкладны змест лекцыі*

Вялікае княства Літоўскае і грамадскае рэфармаванне. Сацыяльна-эканамічны ўздым. Аграрная рэформа. Фальварачнае вядзенне гаспадаркі як умова паскарэння індывідуалізацыі сялянскай сям'і. Феадальна-прыгонніцкі гнёт і сялянскі пратэст. Абвастрэнне нацыянальна-этнічнай самасвядомасці. Рост гарадоў і рамеснай вытворчасці. Магдэбургскае права. Гандлёвыя сувязі. Фарміраванне беларускай народнасці. Сацыяльнае адасабленне шляхты. Рэлігія на беларускіх землях. Стан асветы. Кнігадрукаванне. Рэфармацыйны рух. Контррэфармацыя. З'явы эпохі Адраджэння.

Адносная самастойнасць развіцця этычных тэорый. Беспадстаўнасць уяўленняў аб непадрыхтаванасці беларускага народа да стварэння ўласнай культуры. Традыцыі славутых айчынных маралістаў-асветнікаў папярэдніх эпох (Еўфрасіння Полацкая, Кірыла

Тураўскі, Кліменцій Смаляціч). Народны фальклор — крыніца магутнага пласта педагагічных ідэй. Глыбінныя карані беларускай народнай педагогікі. Асноўны змест народна-выхаваўчых ідэй. Формы народна-педагагічных ведаў. Маральна-выхаваўчы ўхіл народнай педагогікі беларусаў. Этыка-педагагічная скіраванасць тагачасных кніг. Адносіны беларускіх педагогаў да народна-выхаваўчага вопыту. Узаемасувязі беларускага, рускага і ўкраінскага народаў і ўзаемаўплыў іх культур.

Тэалагічная афарбоўка грамадскіх і педагагічных ідэй. Хрысціянства як «педагагічны» рух. Хрысціянскі светапогляд — аснова для фарміравання разнастайных этыка-педагагічных падыходаў. Роля Біблії ў развіцці маральна-выхаваўчых ідэй. Афіцыйная царква і маральнае выхаванне. Зварот беларускіх мысліцеляў да ранне-хрысціянскіх ідэй. Шматканфесійнасць і фарміраванне этыка-педагагічнай думкі. Сацыяльная скіраванасць маральна-этычнай канцэпцыі антытрынітарыяў.

Зварот да арыгінальных твораў антычнасці як вызначальная рыса айчынных мысліцеляў. Аналіз мысліцелямі Беларусі арыстоцелевай, эпікурэйскай і стаіцысцкай канцэпцый маралі. Асаблівасці выкарыстання беларускімі мысліцелямі ідэй антычных філосафаў. Сінтэз антычнай этыкі і раннехрысціянскай маралі. Спроба сумяшчэння рэлігійных і свецкіх пачаткаў.

Шляхі пранікнення ідэй Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусь. Асаблівасці праходжання адраджэнскіх працэсаў на беларускіх землях. Праламленне гуманістычных ідэй еўрапейскага Адраджэння ў бок іх хрысціянізацыі. Выкарыстанне прац араба-мусульманскіх мысліцеляў рэнесансна-гуманістычнага накірунку. Фарміраванне асноў секулярызацыі этыкі.

*Пытанні і заданні для самакантролю*

1. Пакажыце асаблівасці ўплыву тэарэтычнай спадчыны старажытнасці на айчынную педагагічную думку.
2. Ахарактарызуйце сацыяльна-культурныя сувязі беларускага, рускага і ўкраінскага народаў.
3. Пералічыце асноўныя накірункі распаўсюджвання ідэй эпохі Адраджэння на беларускіх землях.
4. Што новага ўнесла ў педагагічную думку Беларусі Рэфармацыя?
5. Дайце ўсебаковы аналіз літоўскага і польскага ўплыву на беларускую культуру.
6. Абгрунтуйце абумоўленасць маральна-выхаваўчых ідэй беларускіх педагогаў-мысліцеляў набыткамі народнай педагогікі.
7. Чаму хрысціянства як маральна-этычная школа чалавецтва знайшло на Беларусі спрыяльную глебу?

**Тэма 2. Педагагічная думка Беларусі эпохі Адраджэння аб мэтах маральнага выхавання і яго ролі ў жыцці грамадства.**

*План*

1. Беларускія асветнікі аб маральнасці як вызначальным фактары ў фарміраванні асобы.
2. Падыходы да вызначэння ролі выхавання ў маральным аздараўленні грамадства.
3. Педагогі Беларусі аб важнасці мэтавызначэння ў любой дзейнасці.



4. Распрацоўка беларускімі мысліцелямі XVI—XVII стст. галоўнай маральна-выхаваўчай мэты.
5. Маральны ідэал ва ўяўленні айчынных асветнікаў.

*Прыкладны змест лекцыі*

Адраджэнскія ўяўленні аб зямным прызначэнні чалавека. Беларускія мысліцелі XVI—XVII стст. аб сэнсе чалавечага жыцця. Ідэя самакаштоўнасці кожнага чалавека. «Ачалавечванне» маралі. Крытыка ідэй аб прадвызначанасці чалавечага лёсу. Дабрачыннае жыццё — узнагарода для душы чалавека. «Царства нябеснае» на зямлі. Роля кожнага індывіда ў арганізацыі ўласнага зямнога жыцця. Антрапацэнтрычныя ідэі педагагічнай думкі. Атэістычныя маральна-выхаваўчыя ідэі на Беларусі. Высокамаральнае жыццё як аснова і мэта існавання чалавецтва. Духоўнасць — «золата» кожнай дзяржавы. Крытыка артадоксаў хрысціянства ў вызначэнні сэнсу жыцця і ролі маральнасці асобы.

Ідэі беларускіх мысліцеляў аб магчымасцях удасканалення чалавечай прыроды. Прычыны духоўнай дэградацыі грамадства. «Законы пісаныя» і «законы сэрца». С. Будны аб месцы маральнага выхавання ў фарміраванні асобы. Спроба тэарэтычнага абгрунтавання пытанняў маральнага выхавання С. Полацкім. Ідэя «чыстай дошкі». Аддзяленне высакароднасці ад высакароднага паходжання. Надканфесійнасць маральнасці. Месца маральнага выхавання ў практычнай дзейнасці школ Беларусі XVI—XVII стст. Маральна-выхаваўчыя ідэі народнай педагогікі.

Значэнне мэтанакіраванасці ў любой дзейнасці. Залежнасць эфектыўнасці выхавання ад канкрэтна вызначаных яго мэт. Антычная формула «калакагатхіі» і ідэі беларускіх мысліцеляў. М. Гусоўскі аб выніках адсутнасці мэт у выхаванні. Грамадская скіраванасць маральна-выхаваўчых мэт. Крытыка арыстоцелеўскага разумення самамэтавасці дабрачыннасці. Арыентацыя на выхаванне дзейснай, актыўнай асобы. Праблемы маральнай свабоды індывіда. Ідэі «самаўлады чалавека». Неабмежаванасць магчымасцей маральнага самаўдасканалення.

Розныя падыходы да разумення чалавечай дасканаласці. Галоўны крытэрый для вызначэння дасканалага чалавека. Скіраванасць на інтэлектуальнае развіццё. Прыстойнасць і адукаванасць. Крытыцызм мыслення. Узаемапераплятенне інтэлектуальных і маральных якасцей. Залежнасць узроўню маральнасці ад агульнага стану культуры індывіда. Грамадская арыентацыя асобы. Адыход ад дагматызму і аскетызму. Адносіны да матэрыяльных даброт. Дэмакратызацыя маральнага ідэалу ў айчыннай педагагічнай думцы. «Залатое» правіла маральнасці і інтравертны характар паводзін чалавека.

*Пытанні і заданні для самакантролю*

1. Як тлумачылі сэнс чалавечага жыцця славутыя айчынныя мысліцелі XVI—XVII стст.?
2. Раскрыйце падыходы дзеячаў педагагічнай думкі Беларусі да абгрунтавання неабходнасці вызначэння мэт у маральным выхаванні.
3. Ахарактарызуйце мэты маральнага выхавання, што распрацоўваліся ў педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння.
4. Якую ролю беларускія педагогі-асветнікі адводзілі выхаванню ў маральным аздараўленні грамадства?

5. Якім бачыўся маральны ідэал чалавека?

6. Пакажыце напрамкі секулярызацыі этыкі ў грамадскай і педагагічнай думцы Беларусі XVI—XVII стст.

**Тэма 3. Распрацоўка зместу маральнага выхавання ў працах айчынных грамадскіх і педагагічных дзеячаў XVI—XVII стст.**

*План*

1. Скіраванасць распрацовак айчынных педагогаў-мысліцеляў на агульначалавечыя маральныя каштоўнасці.

2. Педагагічная думка Беларусі XVI—XVII стст. аб выхаванні нацыянальнай самасвядомасці.

3. Традыцыйныя хрысціянскія дабрачыннасці ў трактоўцы беларускіх мысліцеляў-педагогаў.

4. Педагагічныя і грамадскія дзеячы Беларусі аб размежаванні дабра і зла.

5. Новыя акцэнты ў разуменні маральных якасцей і рыс асобы.

*Прыкладны змест лекцыі*

Злом саслоўнага кодэксу духоўных каштоўнасцей феадальнага грамадства. Змяненне акцэнтаў у вызначэнні прыярытэтнасці маральных дабрачыннасцей.

Погляды на мову як на важнейшы этнавызначальны паказчык. Мэты развіцця кнігадрукавання. Асноўная скіраванасць кніг, што выдаваліся. Уніяцтва і беларуская мова. Патрыятычныя ідэі ў педагагічнай думцы Беларусі. Дэмакратычны характар патрыятычных пачуццяў. Спецыфічнасць зместу маральных якасцей беларускага народа.

Чалавекалюбства, таварыскасць, дружалюбнасць у разуменні айчынных мысліцеляў. Нацыянальны патрыятызм — важнейшая маральная якасць айчыннай педагагічнай думкі. Справядлівасць як вяршыня маральнасці чалавека. Розныя падыходы ў разуменні справядлівасці. Зямная і нябесная справядлівасць. Праўдзівасць — падмурак дабрачыннага жыцця. Новае асэнсаванне традыцыйных якасцей, уласцівых беларускаму народу. Рысы і якасці, выкліканыя да жыцця эпохай Адраджэння і Рэфармацыяй. Пачуццё ўласнай годнасці, жыццярадаснасць, бадзёрасць, мэтанакіраванасць. Сувязь маральнасці з актыўна-дзейсным бокам жыцця чалавека. Важнейшы маральны закон Свяшчэннага пісання — аснова «моцы духоўнай». Новыя акцэнты ў разуменні шчодрасці, міласэрнасці, сціпласці, чуласці, добразычлівасці, дабрыні.

Асноўныя маральныя якасці і вызначэнне зместу маральнага выхавання. Сінтэз феадальна-рыцарскіх уяўленняў з пастулатамі народнай педагогікі пры вызначэнні кодэкса маральных дабрачыннасцей. Роля маральных якасцей у станаўленні прыстойнай асобы. Скіраванасць маральнасці асобы на служэнне агульнаму дабру. Спалучэнне разумовых і пачуццёвых пачаткаў у фарміраванні маральных рыс і якасцей індывіда.

Адмоўныя рысы чалавечага характару. Асэнсаванасць падыходаў у іх вызначэнні. Чалавеканенавісніцтва, азлобленасць, несправядлівасць, ілжывасць, сквапнасць, зайздрасць, баязлівасць, сябелюбства — характэрныя амаральныя якасці людзей. П'янства як «маці ўсіх чалавечых заган». Спосабы адрознення дабрачыннасцей ад заган. Магчымасць неадпаведнасці сутнасці і знешнасці рэчаў і з'яў. Інтэграцыя маральных якасцей. Пераадоленне заган як прыступка да маральнай дасканаласці. Выхоўваемасць маральных рыс і якасцей. Аддзяленне высакароднасці ад высакароднага паходжання.

*Пытанні і заданні для самакантролю*

1. Што новага ў параўнанні з папярэднікамі ўнеслі мысліцелі Беларусі эпохі Адраджэння ў распрацоўку зместу маральнага выхавання?

2. Пералічыце станоўчыя маральныя якасці, якія, на думку айчынных мысліцеляў, павінны быць уласцівы дасканаламу чалавеку.

3. Які агульны сэнс укладвалі педагагічныя дзеячы ў паняцці чалавекалюбства, справядлівасці, сумленнасці, дабрыні і іншыя?

4. Якой трансфармацыі ў педагагічнай думцы Беларусі былі падвергнуты традыцыйныя хрысціянскія дабрачыннасці (пакорлівасць, цярплівасць, умеркаванасць і да т. п.)?

5. Пералічыце чалавечыя рысы і якасці, якія, на думку беларускіх мысліцеляў, вялі да маральнай эрозіі грамадства.

6. Ахарактарызуйце падыходы айчыннай педагагічнай думкі ў пытаннях размежавання маральнага і амаральнага.

**Тэма 4. Мысліцелі Беларусі феадальнага перыяду аб патрабаваннях да арганізацыі маральнага выхавання.**

*План*

1. Беларускія мысліцелі аб ролі разумовага развіцця ў маральным удасканаленні асобы.

2. Ідэі айчыннай педагагічнай думкі аб узаемаадносінах настаўнікаў і выхаванцаў.

3. Патрабаванні беларускіх педагогаў-масліцеляў да форм арганізацыі маральнага выхавання.

4. Прыродаўзгодненасць выхавання ў айчыннай педагагічнай думцы эпохі Адраджэння.

5. Распрацоўка педагогамі — вучонымі Беларусі метадычных асноў арганізацыі маральнага выхавання.

*Прыкладны змест лекцыі*

Патрабаванне пабудовы маральна-выхаваўчага працэсу на інтэлектуальных асновах. Новыя падыходы ў разуменні розуму і мудрасці. Развіццё агульнай асветы — падмурак маральнага аздараўлення грамадства. Этыка-педагагічныя задачы кнігавыдавецкай дзейнасці Ф. Скарыны і яго паслядоўнікаў. Кніжныя веды і багацце жыццёвага вопыту. Рацыяналізм і крытыцызм у этыка-педагагічных ідэях беларускіх мысліцеляў. Суадносіны ведаў і веры. Абсалютызацыя ролі асветы. Рацыяналістычнае асэнсаванне канонаў Свяшчэннага пісання як аснова для карэнных змен у асэнсаванні і арганізацыі маральнага выхавання. Наданне інтэлектуальным якасцям асобы самастойнай этычнай якасці.

Роля настаўнікаў у выхаванні падрастаючых пакаленняў. Новыя патрабаванні да выхавацеляў. Значэнне актыўнасці выхаванцаў ва ўласным маральным удасканаленні. Сямейнае і грамадскае выхаванне. Неабходныя ўмовы эфектыўнасці маральнага станаўлення ў сямейных умовах. Своеасаблівасці выхавання ў беларускай сям'і. Грамадскі кантроль за дзейнасцю школ. Узрастанне ролі школы ў маральным развіцці асобы. Выхаваўчы ўхіл дзейнасці школ Беларусі.

Айчынныя мысліцелі аб гуманізацыі адносін да вучняў. Пратэст супраць аўтарытарызму ў выхаванні. Роля пачуццяў у пасляховасці ажыццяўлення маральна-выхаваўчага працэсу. С. Полацкі аб «празмернай любові» да дзяцей. Педагагічная думка Беларусі аб прыродаўзгодненасці ў выхаванні. Вучэнне аб чатырох чалавечых тэмпераментах. Сувязь маральных дабрачыннасцей чалавека з натуральна-прыродным асяроддзем. Адносіны да астралагічных растлумачэнняў чалавечага лёсу. Ідэі псіхалагізацыі маральна-выхаваўчых падыходаў. Перыядызацыя ўзросту дзяцей пры арганізацыі маральнага выхавання. Неабходныя ўмовы трываласці якасцей асобы, набытых выхаваўчым шляхам.

Дакладнасць, прадуманасць, паслядоўнасць і паступовасць маральна-выхаваўчага працэсу. Сістэматычнасць, інтэнсіўнасць уздзеяння на выхаванцаў. Ідэі беларускіх мысліцеляў аб выкарыстанні прынцыпу нагляднасці ў маральным выхаванні. Роля эмоцый у маральна-выхаваўчым працэсе. Паэтапнае фарміраванне маральных якасцей. Ідэі комплекснага падыходу да выхавання маральных рыс і якасцей асобы.

*Пытанні і заданні для самакантролю*

1. Як ставіліся беларускія асветнікі да агульнаадукацыйнага ўзроўню асобы ў яе маральным развіцці?

2. Пералічыце асноўныя патрабаванні, што прад'яўляліся айчыннымі вучонымі-педагогамі да маральнага выхавання.

3. Якое месца ў маральным фарміраванні падрастаючых пакаленняў адводзілася настаўніку-выхавацелю?

4. Прааналізуйце падыходы беларускіх мысліцеляў да вызначэння ролі сям'і ў маральным выхаванні.

5. Чаму школы аб'яўляліся «майстэрнямі чалавечых душ»?

6. Ахарактарызуйце падыходы айчыннай педагагічнай думкі ў распрацоўцы прынцыпу прыродаўзгодненасці ў выхаванні.

7. У чым праяўлялася патрабаванне гуманізацыі адносін да выхаванцаў?

**Тэма 5. Метады і сродкі маральнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння.**

*План*

1. Беларускія мысліцелі аб маральнай асвеце як падмурку маральнага выхавання.

2. Метад прыкладу — адзін з важнейшых метадаў выхавання ў айчыннай педагагічнай думцы.

3. Беларускія мысліцелі аб ролі прывучэння ў маральным развіцці асобы.

4. Заахвочванні і пакаранні ў маральным выхаванні.

5. Самавыхаванне і перавыхаванне ва ўяўленні беларускіх мысліцеляў XVI—XVII стст.

*Прыкладны змест лекцыі*

Залежнасць паводзін чалавека ад яго самасвядомасці. Веданне маральных норм і правіл — першая прыступка на шляху да маральных вяршынь чалавечай дасканаласці. Беларускія мысліцелі аб неабходнасці завучвання маральных ісцін на памяць. Фарміраванне ў свядомасці ўстойлівых перакананняў шляхам самастойнага асэнсавання маральных патрабаванняў. Скарачэнне забарончых функцый у выхаванні. Павучанні, угаворы, пропаведзі, растлумачэнні, унушэнні як важнейшыя сродкі фарміравання маральнай свядомасці. Выхаваўчая сіла слова. Красамоўства. Майстэрства перакanання. Роля кнігі ў маральным развіцці асобы. Статут Слуцкай школы аб прымяненні метаду перакананняў.

Самапазнанне ўнутранага свету індывіда як неабходная прыступка яго маральнага ўдасканалення. Метад прыкладу ў этыка-педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння. Выкарыстанне станоўчых і адмоўных прыкладаў. Прыклады з прыроды. Прыклады з гісторыі развіцця грамадства, Бібліі і навакольнай рэчаіснасці. Уласны прыклад выхавацеля. Беларускія мысліцелі аб метадзе маральнага прывучэння (практыкаванняў) у фарміраванні дасканалай асобы. Удзел у добрых справах. М. Гусоўскі аб практыкаваннях у ветлівасці, сумленнасці, сціпласці. Практыка выхавання маральна-валявых якасцей. Мнагакратнасць паўтарэння выхоўваючых сітуацый. «Практычная этыка» ў брацкіх школах.

Новыя падыходы ў разуменні метаду пакарання. Пакаранне боскае і пакаранне зямное. Страх перад пакараннем. Прынцып справядлівасці пры пакаранні. Адносіны да фізічных пакаранняў. Асаблівасці прымянення пакаранняў у брацкіх і каталіцкіх школах. Ідэі нямецкага педагога-рэфарматара І. Штурма ў поглядах беларускіх мысліцеляў. Эфектыўнасць метаду заахвочвання прыстойных учынкаў і паводзін. Павага ў якасці ўзнагароды. Уменне выкарыстоўваць узнагароды.

Праца як важнейшы сродак маральнага выхавання. Выкарыстанне эстэтычнага выхавання дзеля дасягнення этыка-педагагічных мэт. Эмоцыі і маральнае развіццё. Сувязь фізічнай загартоўкі з маральным выхаваннем. Асаблівасці выкарыстання тых ці іншых метадаў і сродкаў у залежнасці ад абставін.

Самапазнанне ўнутранага свету індывіда як неабходная прыступка яго маральнага ўдасканалення. Актыўнасць выхаванцаў у сваім маральным фарміраванні. Самавыхаванне асобы. Перавыхаванне як метад «лячэння душы». Складанасць і нізкая эфектыўнасць перавыхавання. Умовы, якія забяспечваюць выніковасць працэсу перавыхавання.

*Пытанні і заданні для самакантролю*

1. Ахарактарызуйце шляхі ўздзеяння на свядомасць асобы пры маральным выхаванні, што вылучаліся ў айчыннай педагагічнай думцы.

2. Якія сродкі метаду перакапання лічыліся найбольш эфектыўнымі?

3. Якія асаблівасці ў выкарыстанні метаду прыкладу былі характэрнымі для айчыннай педагагічнай думкі?

4. Прааналізуйце ідэі беларускіх педагогаў-мысліцеляў у распрацоўцы праблемы самавыхавання асобы.

5. Якое месца ў маральным станаўленні асобы адводзілася метаду прывучэння (практыкаванняў)?

6. Якія патрабаванні прад'яўляліся ў айчыннай педагагічнай думцы да прымянення заахвочванняў і пакаранняў?

7. Як адносіліся беларускія педагогі да самавыхавання і перавыхавання?

**(Заканчэнне будзе)**